УДК 811.161.3

# Афарыстычныя выслоўі ў мастацкім дыскурсе Максіма Багдановіча

Гаўрош Н.В., Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У сістэму вобразных сродкаў Максіма Багдановіча арганічна ўключаюцца яго афарыстычныя выслоўі, у якіх:

– любасць да мілай роднай *краіны-браначкі,* якую ён марыў бачыць вольнай і шчаслівай: *Ты не згаснеш, ясная заранячка, / Ты яшчэ асвеціш родны край. / Беларусь мая! Краіна-браначка! / Устань, свабодны шлях сабе шукай!* (Ты не згаснеш);

– любоў да Радзімы, надзея на яе лепшую долю: *І тчэ, забыўшыся, рука, / Заміж персідскага узору, / Цвяток радзімы васілька* (Слуцкія ткачыхі). *Часам сыходзіць у землю крыніца, / Дзесь у нетрах таёмна бяжыць, / Але мусіць урэшце на волю прабіцца, / Шмат па зямлі яшчэ будзе ліцца-каціцца / І радзімаму краю служыць* (Каганцу). *І толькі на цябе надзея, / Край родны мой!* (Даўно ўжо целам я хварэю);

– чалавек, яго месца на зямлі, сэнс існавання: *Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век! / Жыві і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай* (Жывеш не вечна, чалавек...). *Усё знікае, праходзіць, як дым, / Светлы ж след будзе вечна жывым* (Думы);

– служэнне роднаму краю, яго народу – у гэтым бачыць сваё крэда паэт: *Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем. / Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць, / Брызнуць іскры з халодных каменняў* (Песняру);

– жыццё кожнага чалавека, цэлага народа – актыўны творчы працэс, творчае гарэнне, імкненне пазнаць самога сябе: *Калі хочаш праўдзіва ты жыць, дык пі чару любую, / Але толькі да дна* (Крэда). *Запасіць толькі чужое, не развіваючы свайго... – гэта значыць глуміць народную душу* (Забыты шлях). *Проці цячэння вады / Зможа толькі жывое паплыць, /Хвалі ж ракі заўсягды / Тое цягнуць, што скончыла жыць* (Рушымся, браццця, хутчэй). *Хваробы лечаць і атрутамі* (Уступ). *Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць* (Забыты шлях);

– духоўнасць чалавека – асноўнае ў жыцці: *Добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком.* ***Бо нашто каласы, калі няма васількоў?*** – навошта матэрыяльнае, калі няма духоўнага, – значыць, няма чалавека.

У афарыстычных выслоўях Максіма Багдановіча матэрыялізуецца народная душа, філасофія жыцця, апраўданне чалавечай прысутнасці на зямлі, права народа на нацыянальную самабытнасць і несмяротнасць.